Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_____________В. Р. Языковіч
«____» ____________2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка), спецыялізацыі*
*1-18 01 01-02 01 Інструментальная музыка народная*

2020

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 2013 Народная творчасць (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці. Рэгістрацыйны № С-18-1-68/17 вуч.


**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
*Л. А. Сухаварава,* дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт;
*Л. К. Валасюк,* дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт



**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
*А. Я. Крамко,* дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. І. Жыновіча, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;
*Н. І. Сеўрукоў,* прафесар кафедры баяна-акардэона ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 31.05.2019);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 12.06.2019)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. А. Сухаварава


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Інструментальны ансамбль» з’яўляецца часткай асноўных прафілюючых вучэбных дысцыплін спецыялізацыі «інструментальная музыка народная».

Вучэбная дысцыпліна «Інструментальны ансамбль» звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Спецінструмент», «Аркестравы клас», «Камерны ансамбль», «Методыка работы з аркестрам (ансамблем)», «Інструментазнаўства і інструментоўка», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», «Аркестравая і ансамблевая літаратура», «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару», «Педагогіка», «Псіхалогія» і інш.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – падрыхтоўка спецыяліста высокага прафесійнага ўзроўню да самастойнай дзейнасці ў якасці кіраўніка і ўдзельніка інструментальнага ансамбля, мэтанакіраванага на работу ў творчых калектывах.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль» павінна забяспечыць фарміраванне прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый:

ПК-20 – ужываць новыя інавацыйныя і мультымедыйныя тэхналогіі, фоназапісы;

ПК-23 – уменне планаваць і ствараць уласны рэпертуар музычных твораў інструментальнага ансамбля;

ПК-24 – уменне працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці;

ПК-25 – уменне арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкага густу насельніцтва;

ПК-27 – уменне ствараць аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пералажэнні для ансамбляў;

ПК-28 – уменне самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму;

ПК-29 – уменне ствараць творчыя выступленні інструментальных калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

Асноўнымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– арганізацыя выканальніцкай дзейнасці студэнтаў;

– набыццё студэнтам практычнага вопыту ігры ў ансамблі і работы з калектывам;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалодванне этапамі і метадамі рэпетыцыйнай работы з ансамблем;

– уменне на аснове ўважлівага і ўдумлівага вывучэння нотнага тэксту стварыць і рэалізаваць мастацкі вобраз музычнага твора;

– фарміраванне навыкаў работы калектыву над рознымі выканальніцкімі складанасцямі;

– развіццё ў студэнта здольнасці да абагульнення набытых ведаў і ўмення выкарыстоўваць іх у далейшай рабоце.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– агульныя прынцыпы стварэння інструментальнага калектыву аднароднага і змешанага складу;

– эмацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці ігры ў творчым калектыве;

– асаблівасці складання рэпертуару для інструментальных ансамбляў розных складаў;

– стварэнне і асаблівасці драматургіі музычнага твора ў калектыўнай творчасці;

– псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі інструментальнага ансамбля;

– этапы работы над музычным творам у інструментальным ансамблі;

*умець:*

– вырашаць праблемы складу і стварэння ансамблевага калектыву;

– ажыццяўляць музычна-выканальніцкі аналіз, метадычны разбор твораў;

– праводзіць рэпетыцыі інструментальных ансамбляў розных колькасных складаў;

– падбіраць вучэбны і канцэртны рэпертуар для калектыву рознага тэмбравага складу;

– праводзіць работу з ансамблем над гукавой перспектывай, тэмбравай палітрай твора, сінхроннасцю гучання;

– падрыхтаваць калектыў да канцэртнага выступлення;

*валодаць:*

– метадамі і прыёмамі правядзення рэпетыцый ансамбляў розных колькасных і тэмбравых складаў;

– навыкамі правядзення самастойных заняткаў па вывучэнні партытуры твора;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сродкамі музычнай выразнасці для прафесійнай інтэрпрэтацыі нотнага тэксту;

– навыкамі артыстызму, сцэнічных паводзін пры падрыхтоўцы канцэртнага выканання праграмы на кантрольных уроках, заліках і экзаменах.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль» усяго прадугледжана 706 гадзін, з якіх 356 гадзін – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Сутнасць, практычная мэтазгоднасць і задачы вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль». Інструментальны ансамбль як творчая лабараторыя і аснова прафесійных кампетэнцый студэнтаў.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль». Узаемасувязь з іншымі дысцыплінамі спецыяльнага цыкла. Асноўныя патрабаванні і змест вучэбнай дысцыпліны.

*Тэма 1. Умовы стварэння мастацкага калектыву. Колькасны і тэмбравы склад інструментальных ансамбляў*

Ансамбль як форма калектыўнай дзейнасці і творчая лабараторыя будучых кіраўнікоў і ўдзельнікаў ансамбляў. Умовы і асаблівасці стварэння інструментальнага калектыву. Стварэнне аптымальных умоў для індывідуальнай самарэалізацыі і самаўдасканалення ўдзельнікаў калектыву. Развіццё камунікабельнасці і каштоўнасных арыентацый. Сумяшчальнасць псіхалагічных характарыстык. Выхаванне творчай дысцыпліны, стварэнне псіхалагічнага клімату. Ансамблі аднастайныя і змешаныя: спецыфіка работы і рэпертуару. Колькасныя склады ансамбляў і іх спецыфіка. Адрозненне ад работы з малымі формамі ансамбляў і аркестрамі.

*Тэма 2. Правядзенне рэпетыцый у інструментальным ансамблі*

Планаванне рэпетыцый. Этапы правядзення рэпетыцыі. Выканальніцкія задачы і план твора. Канкрэтнасць заданняў і даступнасць методыкі іх выканання. Працягласць і тэмп вядзення рэпетыцый. Адзінства выканальніцкіх задач, іх сутнасць і асаблівасці. Развіццё каштоўнасных арыентацый, павышэнне камунікатыўнасці і самаўдасканалення ўдзельнікаў. Арганічнае адзінства, адчуванне асабістай творчасці ў калектыўным выкананні. Узаемаразуменне, згода, самакрытычнасць, імкненне да самаўдасканалення. Абмеркаванне вынікаў рэпетыцыі. Генеральная рэпетыцыя. Канцэртнае выкананне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Развіццё навыкаў ігры ў ансамблі.*
*Сінхроннасць гучання інструментальнага ансамбля*

Набыццё і ўдасканаленне навыкаў ігры ў інструментальным ансамблі. Прыёмы і метады развіцця навыкаў ансамблевага выканальніцтва. Калектыўнае музіцыраванне як аснова фарміравання індывідуальнай якасці і індывідуальнасці выканаўцаў. Працаздольнасць, сумленнасць, адпаведны ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі як аснова паспяховай сумеснай працы. Развіццё творчай ініцыятывы. Стварэнне аптымальных умоў для самарэалізацыі. Творчыя інтарэсы і зносіны індывідуальнага і агульнага ў ансамблевым выканальніцтве. Метады развіцця і ўдасканалення навыкаў ігры ў ансамблі. Фарміраванне рытмічнага адзінства калектыву як асновы ансамблевага майстэрства. Выяўленчыя магчымасці рытму. Авалоданне асаблівасцямі дынамікі. Развіццё ўнутранага слыху і навыкаў чытання з ліста. Выхаванне ўдасканалення комплекснага ўспрымання нотнага тэксту.

*Тэма 4. Асноўныя этапы рэпетыцыйнай работы*
*над творам, іх змест*

Агульная характарыстыка этапаў работы над музычным творам.

*Першы этап.* Знаёмства з творам, эпохай, стылем, характэрнымі рысамі і асаблівасцямі творчасці кампазітара. Вывучэнне пажаданняў аўтара. Стварэнне мадэлі твора ў адпаведнасці з задумкай кампазітара. Азнаямленне ўдзельнікаў з асабістамі партыямі. Эскізнае прайграванне ансамблем тэксту твора з мэтай цэласнага ўяўлення характару і музычных вобразаў дадзенага твора.

*Другі этап.* Работа над тэкстам сваёй партыі. Вывучэнне інтанацыйных сэнсаў фраз, сказаў, іх асэнсаванне ў кантэксце ўсёй партытуры. Вырашэнне пытанняў найбольш зручнай аплікатуры, вызначэнне сродкаў пераадольвання выканальніцкіх складанасцей. Звяртанне ўвагі на прыёмы гукаўтварэння, на адзінства штрыхоў, сінхроннасць выканання агогікі, артыкуляцыі і метрарытму. Прастаўленне рэгістраў у акардэонаў і баянаў.

*Трэці этап*. Сінтэз усіх дэталяў зместу твора. Удасканаленне твора ў працэсе рэпетыцый. Асэнсаванне формы, замацаванне трактоўкі, пытанняў артыкуляцыі, тэмпу, метрарытму, стварэнне дынамічнага плана і тэмбравай палітры. Вызначэнне лакаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най і агульнай кульмінацыі. Замацаванне агогікі і іншых сродкаў музычнай выразнасці.

### *Тэма 5. Музычная фактура, дынамічны план, баланс гучання і гукавая перспектыва музычных твораў*

Музычная фактура па гарызанталі (мелодыя) і па вертыкалі (гармонія). Размеркаванне галасоў па выразнасці і насычанасці гучання ў кантэксце твора. Шматпланавасць музыкі ў суадносінах гучання партытуры па гарызанталі і па вертыкалі. Асэнсаванне і замацаванне гэтых суадносін падчас рэпетыцый.

Дынамічны план – аснова выразнасці гукаўтварэння і артыкуляцыі. Дынаміка як аснова балансу гучання паміж партыямі ў інструментальным ансамблі. Роля дынамікі ў ансамблевай вертыкалі. Дынаміка кантрасная і паслядоўная. Удзел дынамікі пры вызначэнні галоўнага ў агульным гучанні. Функцыянальнасць выконваемых галасоў (мелодыя, падгалосак, гарманічнае суправаджэнне, кантрапункт, бас). Значнасць дынамікі ў раскрыцці асаблівасцей вобразаў і стылю твора. Стварэнне гарызантальнай і вертыкальнай гукавой перспектывы.

### *Тэма 6. Сродкі музычнай выразнасці, прыёмы гукаўтварэння, тэмбравая палітра*

Асноўныя сродкі музычнай выразнасці. Метр і рытм як сродкі музычнай выразнасці, іх узаемасувязь. Паняцце «метрарытм», яго сувязь з характарам твора. Аналіз метрарытмічнай структуры твора. Рытмічныя акцэнты і іх асноўныя віды. Значнасць рытмічнай зладжанасці і яе выхаванне падчас рэпетыцый.

Асноўныя віды гукаўтварэння і штрыхоў розных інструментаў у ансамблі. Класіфікацыя штрыхоў. Штрыхі як сродак музычнай выразнасці. Выкарыстанне штрыхоў, іх уплыў на характар гучання твора.

Роля гукавых колераў у ансамблях розных тэмбравых складаў. Суадносіны тэмбравай палітры. Каларыстычная функцыя тэмбру, змяненне тэмбру з дапамогай рэгістраў баяна і акардэона. Тэмбравыя краскі струнных інструментаў. Магчымасці спалучэння і раз’яднання тэмбраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Артыкуляцыя, фразіроўка, тэмп, агогіка, цэзуры*

Артыкуляцыя як адзін з асноўных элементаў выразнасці ансамблевай фактуры. Сродкі артыкуляцыі ў ансамблях аднастайных і змешаных. Артыкуляцыя ідэнтычная і кантрасная. Захаванне адзінства артыкуляцыі, адчуванне логікі цэласнага гучання. Фразіроўка як адзін з асноўных элементаў мастацкага выканання. Асноўныя віды фразіроўкі. Меладычная лінія твора. Уплыў фразіроўкі на структуру твора, дынамічны план, структуру пабудовы мелодыі, вылучэнне кульмінацый.

Значэнне тэмпу як сродку стварэння мастацкага вобраза. Тэмп як сродак дасягнення мастацкага выніку. Адхіленні ад тэмпу раптоўныя і паступовыя. Гібкасць і пераменнасць тэмпавых адхіленняў. Агогіка – адна з асноўных задач валодання ансамблевай тэхнікай.

Цэзуры. Функцыі і віды цэзур у ансамблевым выканальніцтве. Сэнс цэзуры ў працэсе выканання твора.

*Тэма 8. Ансамблевая тэхніка, яе сэнс і асаблівасці*

Навыкі ігры ў інструментальным ансамблі. Комплекс выканальніцкіх сродкаў, неабходных для рэалізацыі мастацкага сэнсу твора. Паглыбленне работы над творам для разумення вобразнага зместу выконваемага твора. Ідэнтычнасць артыкуляцыі і штрыхоў як аснова ўдасканальвання ансамблевай тэхнікі. Паляпшэнне тэхнікі выканання штрыхоў, метрарытму, тэмпу і агогікі. Асэнсоўванне дынамічнага і тэмбравага балансу, узмацненне сінхроннасці гучання. Аб'яднанне выканальніцкіх манер усіх удзельнікаў ансамбля пры захаванні істотных рыс кожнага выканаўцы. Спалучэнне адзінай перадачы ўсіх асаблівасцей зместу нотнага тэксту. Выдатная ансамблевая тэхніка як аснова стварэння мастацкага вобраза твора.

*Тэма 9. Асаблівасці ансамблевага акампанементу. Візуальны кантакт у ансамблевым выканальніцтве*

Асаблівасці ансамблевага акампанементу. Спецыфіка акампанементу салісту-інструменталісту, салісту-вакалісту, хору, танцавальнаму калектыву. Вырашэнне пытанняў інтэрпрэтацыі паміж удзельнікамі ансамбля і салістамі. Узгадненне творчых намераў удзельнікаў: тэмпу, дынамікі, агогікі, цэзур, артыкуляцыі, мастацкага вобраза і інш. Метады правядзення рэпе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыцыі з салістамі і мастацкімі калектывамі. Сінхроннасць гучання інструментальнага ансамбля з салістам. Візуальны кантакт як аснова дасягнення выканальніцкага ансамбля. Выкарыстанне сувязі ўдзельнікаў ансамбля і салістаў з дапамогай позірку, мімікі, руху галавы і корпуса. Неабходнасць аўфтакту ў пачатку выканання і пры заканчэнні твора. Візуальны кантакт як сродак стварэння дыялогаў пры выкананні агогікі, цэзур, пры пачатку і заканчэнні гучання твора, шматлікіх мастацкіх намераў.

*Тэма 10. Уплыў жанрава-стылістычных асаблівасцей на выкананне музычных твораў у ансамблі*

Паняцце стылю і жанру. Стылі розных эпох, мастацкі стыль, выканальніцкі стыль, кампазітарскі стыль. Уплыў эпохі і стану музычных школ на развіццё стылю. Прынцыпы падыходу да выяўлення стылістычных асаблівасцей музычнага твора. Асаблівасці выканальніцкага стылю. Асаблівасці кампазітарскіх стыляў. Эвалюцыя ансамблевых і аркестравых стыляў. Асаблівасці стылю народна-інструментальнага музіцыравання. Ансамблі народных інструментаў і стылявыя нацыянальныя традыцыі. Фальклорны стыль, яго разнавіднасці і асаблівасці. Джазавы і разнавіднасці эстрадных стыляў.

*Тэма 11. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў і мультымедыйных сістэм падчас рэпетыцый і канцэртных выкананняў твораў у інструментальным ансамблі*

Магчымасці сучасных тэхнічных сродкаў. Відэа- і аўдыязапісы выканання твораў ансамблем. Праслухоўванне і абмеркаванне запісу твораў з удзельнікамі рэпетыцыі. Праслухоўванне запісу твораў у выкананні вядучых майстроў і калектываў. Прагляд мультымедыйных запісаў для выкарыстання іх у рабоце над творам падчас рэпетыцый. Стварэнне відэарада для ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння твора на ўдзельнікаў ансамбля і слухачоў падчас канцэртнага выступлення ансамбля.

*Тэма 12. Вучэбны і канцэртны рэпертуар. Канцэртная, конкурсная і фестывальная дзейнасць*

Рэпертуар як аснова паспяховай канцэртнай дзейнасці калектыву. Роля вучэбнага рэпертуару ў выхаванні эстэтычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

густу студэнтаў. Жанравы склад рэпертуару. Значэнне твораў розных стыляў і жанраў для паляпшэння музычнага кругагляду ўдзельнікаў. Знаёмства з лепшымі ўзорамі міравой класічнай і сучаснай музыкі, творамі беларускіх кампазітараў. Стварэнне і захаванне свайго спецыфічнага рэпертуару.

Канцэртнае выступленне як вынік працы выканаўцаў, стымул да далейшага творчага і прафесійнага росту ўдзельнікаў ансамбля. Асновы сцэнічных паводзін удзельнікаў інструментальнага ансамбля. Выдатнае валоданне тэкстам выконваемых твораў, упэўненасць у сваіх выканальніцкіх здольнасцях – аснова паспяховага канцэртнага выступлення. Эмацыянальная накіраванасць на раскрыццё творчай фантазіі, мастацкага сэнсу і музычных вобразаў твора. Засяроджанасць увагі, творчы намер як аснова зніжэння эмацыянальнага напружання і хвалявання перад выступленнем. Узмацненне цікавасці да калектыўнага музіцыравання.

Перадумовы ўзнікнення конкурснай і фестывальнай практыкі інструментальных калектываў Беларусі. Асаблівасці падрыхтоўкі конкурснага і фестывальнага рэпертуару. Прапаганда беларускай выканальніцкай школы і твораў беларускіх аўтараў на міжнародным узроўні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | аўдыторныя заняткі | кантралюемая самастойная работа | |
| | Уводзіны | 1 | | |
| 1 | Умовы стварэння мастацкага калектыву. Колькасны і тэмбравы склад інструментальных ансамбляў | 20 | 4 | кантрольны ўрок |
| 2 | Правядзенне рэпетыцый у інструментальным ансамблі | 20 | 5 | залік |
| 3 | Развіццё навыкаў ігры ў ансамблі. Сінхроннасць гучання інструментальнага ансамбля | 26 | 4 | кантрольны ўрок |
| 4 | Асноўныя этапы рэпетыцыйнай работы над творам, іх змест | 26 | 4 | кантрольны ўрок |
| 5 | Музычная фактура, дынамічны план, баланс гучання і гукавая перспектыва музычных твораў | 30 | 6 | залік |
| 6 | Сродкі музычнай выразнасці, прыёмы гукаўтварэння, тэмбравая палітра | 26 | 4 | кантрольны ўрок |
| 7 | Артыкуляцыя, фразіроўка, тэмп, агогіка, цэзуры | 30 | 6 | кантрольны ўрок |
| 8 | Ансамблевая тэхніка, яе сэнс і асаблівасці | 24 | 4 | экзамен |
| 9 | Асаблівасці ансамблевага акампанементу. Візуальны кантакт у ансамблевым выканальніцтве | 22 | 5 | кантрольны ўрок |
| 10 | Уплыў жанрава-стылістычных асаблівасцей на выкананне музычных твораў у ансамблі | 20 | 4 | залік |
| 11 | Выкарыстанне тэхнічных сродкаў і мультымедыйных сістэм падчас рэпетыцый і канцэртных выкананняў твораў у інструментальным ансамблі | 26 | 6 | залік |
| 12 | Вучэбны і канцэртны рэпертуар. Канцэртная, конкурсная і фестывальная дзейнасць | 28 | 6 | экзамен |
| | **Усяго…** | **298** | **58** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Алексеев, К.* Как организовать самодеятельный ансамбль народных инструментов / К. Алексеев. – М. : Музыка, 1982. – 173 с.

2. Беларуская музыка XVI–XVII стст.: вучэб.-метад. рэк. для ігры ў ансамблі / склад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : БДК, 1990. – 37 с.

3. *Каргин, А.* Работа с самодеятельным оркестром русских народных инструментов / А. Каргин. – М. : Музыка, 1982. – 159 с.

4. *Ризоль, Н.* Очерки о работе в ансамбле баянистов / Н. Ризоль. – М. : Сов. композитор, 1986. – 225 с.

5. *Розанов, В.* Русские народные инструментальные ансамбли / В. Розанов. – М. : Музыка, 1972. – 120 с.


*Дадатковая*


1. *Бубен, В. П.* Учебно-педагогический репертуар для баянов, аккордеонов: хрестоматия: с мультимедийным приложением. Вып. 2 / В. П. Бубен, В. Г. Федорук. – Минск : БГПУ, 2012. – 74 с.

2. *Банин, А.* Русская инструментальная музыка фольклорной традиции / А. Банин. – М. : Музыка, 1997. – 125 с.

3. Вяртанне да спадчыны (зб. канцэртных твораў для ансамбля цымбалістаў) : вучэб. дапам. / уклад. Я. Гладкоў. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 88 с.

4. *Гладков, Е.* Совершенствование приемов звукоизвлечения и артикуляции при игре на белорусских цимбалах / Е. Гладков. – Минск : Беларусь, 1976. – 95 с.

5. *Имханицкий, М.* История исполнительства на русских народных инструментах / М. Имханицкий. – М. : Изд-во РАМ им. Гнесиных, 2002. – 351 с.

6. *Имханицкий, М.* Новое об артикуляции и штрихах на баяне / М. Имханицкий. – М. : Изд-во РАМ им. Гнесиных, 1997. – 44 с.

7. *Клебанов, Д.* Искусство инструментовки / Д. Клебанов. – Київ : Музична Україна, 1972. – 219 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*8. Липс, Ф.* Искусство игры на баяне / Ф. Липс. – М. : Музыка, 1982. – 160 с.

*9. Максимов, Е.* Оркестры и ансамбли русских народных инструментов / Е. Максимов. – М. : Сов. композитор, 1983. – 137 с.

*10. Максимов, Е.* Ансамбли и оркестры гармоник : пособие для руководителей самодеятельных коллективов / Е. Максимов. – М. : Сов. композитор, 1979. – 176 с.

*11.* Методика обучения игре на народных инструментах / сост. П. Говорушко. – Л. : Музыка, 1975. – 32 с.

*12. Мицуль, М.* Артикуляция на белорусских цимбалах / М. Мицуль. – Минск : МИК, 1985. – 15 с.

*13. Паньков, О.* О работе баяниста над ритмом / О. Паньков. – М. : Музыка, 1986. – 62 с.

*14. Прошко, Н.* Методические рекомендации для оркестров и ансамблей народных инструментов / Н. Прошко. – Минск : БГК, 1972. – 15 с.

*15.* Народно-инструментальное исполнительство Беларуси: вопр. теории, истории и методики / ред.-сост. Л. Шибаева. – Минск : БелГИПК, 2004. – 252 с.

*16. Розанов, В.* Инструментоведение: пособие для руководителей оркестров русских народных инструментов / В. Розанов. – М. : Сов. композитор, 1974. – 135 с.

*17. Тихонов, В.* Основы методики музыкальных занятий в самодеятельном оркестре народных инструментов / В. Тихонов. – М. : Музыка, 1978. – 115 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне «Інструментальны ансамбль» ажыццяўляецца з дапамогай наступных форм дыягностыкі:

– выкананне і запіс музычных твораў падчас рэпетыцыі;

– праслухоўванне і абмеркаванне выканання музычнага твора;

– аналіз відэазапісу ўдзельнікамі ансамбля;

– кантрольны ўрок;

– канцэртная дзейнасць;

– залік;

– экзамен.

## Рэкамендацыі па арганізацыі СРС

Самастойная работа па дысцыпліне «Інструментальны ансамбль» уключае ў сябе вывучэнне ансамблевых партый, стварэнне пералажэнняў музычнага матэрыялу, пошук новых сучасных музычных твораў з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў. Сістэматызаваць дадзеную работу магчыма шляхам метадычнага аналізу, вывучэння вучэбных, метадычных і навуковых публікацый з пераліку асноўнай і дадатковай літаратуры. На якасць самастойнай падрыхтоўкі значны ўплыў акажа прагляд і аналіз аўдыя- і відэаматэрыялаў, наведванне і ўдзел у канцэртных і конкурсна-фестывальных мерапрыемствах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ**

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі*
*1-18 01 01-02 01 Інструментальная музыка народная*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,56. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ